Cana asobnaha numaru 20 hr. | Pierasyła apłačana ryčałtam

Nr. 43 (588). | Wilnia, Niadziela 25 Listapada 1934 h. | Hod X (XVIII).

# БЕЛАРУСКАЯ КРЫНІЦА | BIEŁARUSKAJA KRYNICA

Palityčnaja, hramadzkaja i literaturnaja hazeta.

Adras Redakcyi i Administracyi: WILŃIA, ZAWALNAJA 1—1 (Wilno, Zawalna 1—1). Redakcyja adčyniena ad 9 hadz. ran. da 4-aj uwieč.

HAZETA WYCHODZIĆ RAZ U TYDZIEŃ.

„Biel. KRYNICA“ kaštuje na hod—4 zał., na paŭhoda — 2 zał., na 3 miesiacy—1 zał. Zahranicu ŭdwaja daražej. Ceny abwiestak pawodle ŭmowy.

## Якой павінна быць нашая палітычная арганізацыя?

(*Да справы абнаўленьня БХД*).

Наўперад папраўлю карэктарскую абмылку ў маім арт «Да рэарганізацыі БХД» ў № 40 «Беларускай Крыніцы». У радкох 1 —22 гэнага арт. надрукавана: „Калі-б у дальшай будучыне спосаб арганізаваньня і праграма яе не адказвалі вымаганьням жыцьця, *дык арганізацыя шакая страціць значэньне ў гэнай дальшай будучыні.* Замест паказанага курсывам, у маім рукапісе было: *дык арганізацыя дзейная і дужая ў сучасны мамэнт, заўсёды патрапіць прыстарнавацца да новых вымаганьняў жыцьця ў будучыні дальшай.*

Далей мушу заценіць, што я не спадзяваўся закіду, зробленага мне староньнікам абнаўленьня ў арт. «Першыя чатыры пункты» (№ 41 «Бел Кр.»), быццам я выступаю проці пунктаў грамадзкага зьместу Я выступіў за *зьмест нацыянальны* новае арганізацыі. А як-жа нацыянальны зьмест можа ня быць грамадзкім? Гэта-ж нацыя ня толькі найвялікшая грамада, але ёсьць сумаю, злучэньнем усіх грамадаў данае народнасьці!

На пачатку новага арт. добра будзе зусім ясна азначыць, аб чым я буду гаманіць. Іншыя прыхільнікі абнаўленьня, артыкулы каторых на гэтую тэму друкаваліся ў „Бел. Кр.“, пішуць болей аб тым, якой павінна быць новая *праграма*, г. зн. што мае быць надрукавана ў тэй брашурцы, у каторай будуць зьмешчаны пагляды, імкненьні й дамаганьні новае арганізацыі палітычнае. А я ўважаю, што наўперад трэба ўстанавіць, *якой павінна быць сама арганізацыя,* а тады праграма будзе толькі простым слоўным афармленьнем характару яе. Нічога няма лягчэйшага, як напісаць харошую праграму. Гэтулькі ёсьць харошых словаў! Але калі харошай праграме ня будзе адпавядаць харошая дзейнасьць арганізацыі, дык ад такой праграмы ані ня будзе карысьці. Калі дазнаныя купцы закладаюць гандлёвую супалку, дык спачатку азначаюць яе дзейнасьць, а потым ужо пераходзяць да статуту. Зрабема гэтак і мы!

У арт «Да рэарганізацыі БХД» я разгледзіў толькі адзін, найважнейшы мамэнт, пайменна, што дабро беларускага народу павінна ў новай арганізацыі быць вышэй за ўсё і што будучая арганізацыя палітычная павінна быць шырокай, агульна-беларускай. У гэтым мамэнце зьмешчана і дамаганьне гаспадарственнае незалежнасьці Беларускага Народу, бо, любячы яго, ня можна ставіць граніцаў у ягоным разьвіцьці, ня можна бараніць яму паўніні нацыянальнага жыцьця, але дабівацца гэтага.

### ВЕРА.

Калі я люблю свой народ, дык жадаю яму шчасьця ня толькі на гэтым сьвеце, але й спасеньня на тым. А дзеля таго адным з галоўных мамэнтаў у дзейнасьці новай арганізацыі павінна быць вера (рэлігія). Вера апрача таго ёсьць найвялікшай апораю моральнасьці. Дык арганізацыя, як такая, павінна позытыўна й актыўна адносіцца да веры, паддзержываць яе і пашыраць рэлігійнасьць паміж сваймі сябрамі і ўсім народам, а асобныя сябры арганізацыі могуць адносіцца да веры позытыўна і адначасна актыўна, або аставацца пасыўнымі, але ніколі ня могуць выступаць проці веры.

Ведама, маю наўвеце веру хрысьціянскую, але без царкоўнасьці (касьцельнасьці), бо апошняя стварыла-б падазронасьць паміж сябрамі арганізацыі і разьбіла-б яе суцэльнасьць. У справах царквы-касьцёла арганізацыя павінна зварочваць увагу на іх старану нацыянальную: каб у царкоўным (касьцельным) жыцьці панавала беларуская мова, каб казані былі пабеларуску, каб духавенства й гіерархія былі беларускія, каб яны працавалі для Беларускага Народу і гадавалі моладзь і старшых у беларускім дусе, — адным словам, каб з боку нацыянальнага ўсе цэрквы-касьцёлы ў Беларусі былі беларускія. Але арганізацыя, як такая, не магла-б пашыраць праваслаўя, каталіцтва ці іншага кірунку хрысьціянска-*царкоўнага*.

Аўтар гэтага артыкулу не ўважае шкоднымі палітычна-рэлігійныя арганізацыі беларусаў праваслаўных або беларусаў каталікоў, але лічыць, што да такіх арганізацыяў могуць належыць толькі свае вернікі, г. зн. да арганізацыі праваслаўных — праваслаўныя, да каталіцкай — каталікі. Апрача таго на чале кожнае працы павінны стаяць людзі найболей да яе прыгатаваныя. Усялякія эрзацы (замена чагось праўдзівага штучным) бываюць заўсёды далёкія ад дасканальнасьці, а ў жыцьці арганізацыйным найчасьцей шкодныя. Нельга ўчыніць хлеба з кукурузы, замест аржаной мукі, бо з гэткага цеста сьпячэцца ня хлеб, а мамалыга (цьвярдыя нясытныя й нясмачныя камы з кукурузы, у краёх, дзе яе сеюць).

Каб палітычна-рэлігійныя арганізацыі нармальна й добра разьвіваліся, на чале іх мусяць стаяць духоўныя, як людзі найлепей да кіраўніцтва ў такіх арганізацыях прыгатаваныя. Дзеля таго плоднай і карыснай была дзейнасьць Беларускай Хрысьціянскай Злучнасьці.

Цяперака польскі арцыбіскуп забараніў беларускім ксяндзом належаць да Беларускай Хрысьціянскай Дэмакрацыі, а праваслаўнае духавенства беларускае, хоць і не дастала, здаецца, афіцыяльнай забароны належаць да беларускіх партыяў, але забарона такая даўно створана фактычна. Відавочна галоўна дзеля гэтага беларускае духавенства каталіцкае ані праваслаўнае, наагул кажучы, ня мае цяпер ахвоты належаць да палітычных арганізацыяў. Пры такіх абставінах немагчымы цяперака, прынамся немагчымы ўдалыя, палітычна-рэлігійна царкоўныя (касьцельныя) арганізацыі беларускія.

Але калі немагчымы арганізацыі *палітычна* царкоўныя (касьцельныя), дык зусім магчымыя і канечна патрэбныя беларускія арганізацыі культурна-царкоўныя (касьцельныя), як каталіцкія, так і праваслаўныя, на чале каторых павінны стаць каталіцкія й праваслаўныя духоўнікі — сьвядомыя беларусы. Арганізацыі такія, ведама, не маглі-б належаць да агульна-беларускай арганізацыі *палітычнай*, але пажадана, каб асобныя іх нядухоўныя сябры да яе належалі. Гэткім парадкам была-б праца і ў царкоўным (касьцельным) жыцьці, што прычынілася-б да ўважнейшых адносінаў да беларускага касьцельнага (царкоўнага) жыцьця наагул, да яго паглыбленьня, а з другога боку, была-б захавана беларуская палітычная суцэльнасьць.

Прага. *Дзейны Сьведка.* (Д. б)

Św.  p.

**Prafesar**

**BRANISŁAŬ**

# EPIMACH-ŠYPIŁA

**Lektar hreckaha jazyka ŭ Imperatarskaj rymska-katalickaj Duchoŭnaj Akademii. Pamocnik bibliotekara Imperatarskaha Pieciarburskaha Uniwersytetu. Lektar łacinskaha jazyka na wiačernich ahulna-nawukowych Kursach dla ŭzrosłych A. S. Čarniajewa. Wučyciel himnazii dla chłapcoŭ pry kaściele św. Kaciaryny. Čynny siabra Wiciebskaj nawukowaj Archiŭnaj Kamisii. Siabra Instytutu Biełaruskaj Kultury i paźniej siabra Biełaruskaj Akademii Nawuk u Miensku. Pioner adradžeńnia biełaruskaha narodu.**

Pamior 6 červienia sioletniaha hodu ŭ Leninhradzie.

Żałobnaje nabaženstwa za supakoj dušy Jahonaj adbudziecca 1 XII. s. h. a hadz. 8-aj u kaściele św. Mikałaja ŭ Wilni. Żałobnaja akademija adbudziecca 8 XII s. h. a hadz. 19-aj u Biełaruskim Instytucie Hasp. i Kultury. (Wilnia, wul. Zawalnaja 1).

## † Św. p. praf Br. Epimach-Šypiła.

6.VI. siol. h. u Leninhradzie pamior praf. Branisłaŭ Epimach Šypiła Sumnaja heta wiestka dajšła da nas tolki niadaŭna.

Niekalki hadoŭ tamu praz Ameryku dawiedalisia my, — ab čym pisali ŭ „Bieł. Krynicy“, — što Šypiła ŭ Miensku byŭ balšawikami aryštawany, siadzieŭ paru miesiacaŭ u wastrozie i ŭreščie byŭ wysłany ŭ Leninhrad. Padčas jahonaha aryštu ahienty G P.U. zabrali bahaty archiŭ niaboščyka, u jakim šmat było redkaha matarjału da historyi biełaruskaha adradžeńnia. Los henych matarjałaŭ niawiedamy. Šypiła wysłany byŭ u Leninhrad za biełaruskaść. Spatkaŭ jaho los, jak i mnohich inšych biełaruskich wučonych, paetaŭ, piśmiennikaŭ i dziejačoŭ.

Paśla ssyłki, Šypile astawałasia čakać tolki śmierci, da jakoj jaho niaŭchilna wioŭ hoład. Starejšy ŭžo wiekam, nia moh jon doŭha pražy u syrym Leninhradzie na prawoch pajka ssylnaha palityčnaha aryštanta.

Niaboščyk byŭ čaławiek cichi i skromny. Dziela hetaha biełarusy ab im ahułam mała wiedajuć. Tymčasam heta byŭ haračy i zasłužany biełaruski patryjot, apiakun biełaruskaj moładzi, adzin z pieršych pioneraŭ biełaruskaha nacyjanalnaha adradžeńnia. Pa Bahuševiču — heta byŭ badaj pieršy pracaŭnik na biełaruskaj niwie. Rodam byŭ z Połaččyny.

Pokulšto paświačajem św. p. prafesaru Šypile hetych kolki ŭ wah, a reštu dapoŭnić Bieł. Instytut Hasp i Kultury, jaki ŭ čeść niaboščyka, jak dawiedwajemsia, ładzić akademiju, z adpawiednym ab im referatam, ab čym pawiedamlajem biełaruskaje hramadzianstwa

# Jak na XX-ty wiek, dyk dawoli cikawaja historyja...

Pad zahałoŭkam „Što było ŭ Marcinkancach (Da wiedama Biełastockaha wajawody.)", litoŭski časapis „Viln. Rytojus" Nr. 89 siol. h. padaje nastupnyja wiestki.

—„Sioleta letam — čytajem tam — padčas światа Božaha Cieła, kali kaścielnym świntarom u Marcinkancach išła pracesija, miascowyja palicyjanty Jędrzejczyk i Płoński, pry pomačy sołtysa Symona Miškinisa, zapisali proźwiščy tych litowak, jakija išli z pracesijaj u litoŭskich šapačkach. Paśla, wyšaŭšy z świntara, jašče raz zapisali proźwiščy niekatorych mužčyn, jakija byli ŭ takich-ža šapačkach. Paśla niekatoraha času niekalki asob atrymali pawiedamleńnie, što Horadzienski pawietawy starasta, za našeńnie litoŭskich šapačak, pakaraŭ ich pa 5 zał. štrafu. Usie pakaranyja napisali da starasty padańnie, u jakim ćwierdzili, što jany nia čujucca winawatymi i prasili sprawu ich pieradać u Akružny Sud. Starasta, zamiest spoŭnić ich prośbu, zahadaŭ hminnaj uładzie ŭwa ŭsich pakaranych zrabić dopyt. Hminnaja ŭłada ŭ wieraśni mies. tak i zrabiła. Paśla hetaha ŭsie pakaranyja ŭznoŭ atrymali zaklik prybyć 25.X u Horadniu „na rosprawę". Zaklik atrymali 14 asob.

U Horadniu z Marcinkancaŭ bolš, jak 70 klm. darohi. Piechatoj iści zaciažkaja reč, a ciahnikom jechać kaštuje bolš jak 8 zał. Dziela hetaha nie adzin z paklikanych i nia prybyŭ, tymbolš, što ŭ zakliku było zaznačana, što „rosprawa" adbudziecca, kali paklikanyja i nia prybuduć.

Ale woś 3.XI usie paklikanyja ŭznoŭ atrymali zaklik prybyć na „posterunak" palicyi ŭ Marcinkancach 4.XI na hadzinu 8 rana. Paklikanyja prybyli. Tam im komendant palicyi Adam Koenig zajawiŭ, što ŭsich ich siańnia palicyja pahonie ŭ Horadniu.

Tak i stałasia. Usich ich a hadz. 11 uzbrojeny palicyjant Jędrzejczyk pahnaŭ u Horadniu. Išli z pierapynkami. Usiaho ŭwajšli piechatoj 72 klm.

U Paŭpach henyja ludzi ŭ palicejskim aryšcie byli trymany ad 17 hadziny da 7 rana, u Ježeronach — 2 hadziny. Tut zachwareła Frania Kunipaite, jakuju dalej pawiaźli. U Wierciališkach načawali ŭ syrym pohrabie pad domam hminy. Z Wierciališak da Horadni daroha była najciažejšaja, bo ŭžo ŭsie byli duža zmučanyja i padbiŭšysia na nahach. Dziaŭčaty ŭžo zusim nie mahli iści, bo ich wobuj užo byŭ padzioršysia, dyk išli basanož i mieli nohi paranienyja i pakrywaŭlenyja.

U Horadni usich pryhnanych pieradali miascowaj palicyi, śledčamu addziełu. Tut usich pieratreśli i dapytali. Paśla hetaha mužčyny pawinny byli piławać drowy i myć u pakojach. Byŭ tak-ža zahad pracawać i dziaŭčatam, ale hetyja admowilisia. Tut u palicyi trymali ich ad 9 da 12 hadz. Tady pahnali da Starasty. Tam ich dapytaŭ starastaŭ zastupnik, jaki skazaŭ: „Wy abwinawačany nie za litoŭskija šapački, ale za demonstracyju prad kaściołam". Abwinawačanyja abjaśnili, što jany nie rabili nijakaj demonstracyi, a tolki jšli ŭ kaścielnaj pracesii. Tady starastaŭ zastupnik zajawiŭ, što hetym razam kara im darujecca i što litoŭskija šapački nasić možna, ale što ŭ ich hramadami chadzić nia možna. Pry tym starastaŭski referent paradziŭ, kab da litoŭskich šapačak dy dačapić polskich koleraŭ šniuročki"... —

Na hetym i kaniec. Praŭda,— cikawa?

*M. Dubrowič.*

# Polščyna ŭ Prawasłaŭnaj Carkwie.

Mitrapalit Prawasłaŭnaj Carkwy ŭ Polščy zahadaŭ zarhanizawać specyjalnuju kamisiju, jakaja maje pierałažyć na polskuju mowu prawasłaŭnuju liturhiju. Henaja kamisija biezadkładna prystupaje da pracy.

Z hetaha bačym, što chutka pajawicca ŭ prawasłaŭnaj Carkwie bahasłužeńnie papolsku. Cikawa, jak na našych ziemlach baciuški da liturhii papolsku adniasucca. My wiedajem, što da biełaruskaj mowy ŭ propawiedziach ajcy duchoŭnyja ŭ bolšaści adnosiacca zdaloku i niaprychilna, trymajučysia maskoŭščyny. Da polščyny jany z wiedamych pryčyn adnosiacca bolš „pa swojsku" i bolš „prychilna". Dziela hetaha, treba spadziawacca, što niekatoryja baciuški, bolš usłužliwyja i lepš „čułyja" ŭ pačućci polskaha patryjotyzmu, niezadoŭha pačnuć i liturhii prawić papolsku.

Pry hetym treba zaznačyć, što mitrapalit Dzianis, adnačasna z hetym zahadam, prykazaŭ tak-ža ŭsiamu

[redacted]

prawasłaŭnamu duchawienstwu ŭ polskaj dziaržawie, kab wa ŭsich praw. cerkwach u Polščy ŭ dziaržaŭnyja światy: 11 listapada, 3 maja dy na imianiny Prezydenta i marš. Piłsudzkaha piajali polski relihijna-narodny himn „Bože coś Polskę".

# Liha Narodaŭ i konferencyja razbrajeńnia.

Niespakojna ŭ mižnarodnaj palitycy. Biezhraničnaje zbrajeńnie, pakty, sajuzy i ŭsialakija inšyja jaŭnyja i skrytyja družby dziaržaŭ, a takža ruchi paniawolenych narodaŭ,—usio heta razam mocna niepakoić świet. Adny blokujucca, kab utrymać sučasnaje palityčnaje pałažeńnie, a druhija, kab źmianić jaho na lepšaje, inšyja padhataŭlajucca, kab padčas ewentualnaj źmieny sučasnaha palityčnaha pałažeńnia być hatowymi ŭziać los swajho narodu ŭ swaje ruki. Heta ŭsio biarecca wyrašać Liha Narodaŭ z swaimi kamisijami i konferencyjami. Liha Narodaŭ, jak my nia raz užo kazali, heta liha dziaržaŭ, i tolki tych dziaržaŭ, jakija starajucca sučasny palityčny stan, asabliwa ŭ Eŭropie, pratrymać mahčyma najdaŭžej.

Dziela razhladu hetkich spraŭ sabrałasia i ciapier —hetymi dniami— Liha Narodaŭ. Źjechalisia pradstaŭniki dziaržaŭ: Francyi, Anhlii, Juhasławii, Polščy, z amerykanskaha kontynentu, pradstaŭnik Sawietaŭ i inšyja. Buduć naradžacca, jak uspakoić padniawolnych, udziaržać u pasłušnaści słabiejšych i jak padzialicca silnym swaimi ŭpływami na słabiejšych.

Pobač z Lihaj Narodaŭ sabrałasia hetymi dniami i miždziaržaŭnaja konferencyja razbrajeńnia. Na henaj konferencyi pradstaŭniki azbrojenych dziaržaŭ haworać ab razbrajeńni, ale tych dziaržaŭ, jakija niezdawoleny z sučasnaha palityčnaha pałažeńnia.

Słowam, baraćba słabiejšych i paniawolenych z silnymi i panujučymi za wolu i sprawiadliwaść zmušaje i Lihu i konferencyju razbrajeńnia šukać abo siły ŭspakajeńnia, abo kompromisu razbrajeńnia ci dazbrajeńnia. Heta adnak sprawy nie wyrašaje i kali silnyja nia pojduć na ŭstupki, budzie jana wyrašacca zbrojaj.

# Francyja wysialaje polskich rabotnikaŭ.

Francuski ŭrad pastanawiŭ bolš nia prymać z zahranicy rabotnikaŭ i dakanać ścisłuju pierasartoŭku siarod emihrantaŭ rabotnikaŭ. Heta dziela taho, kab dać rabotu francuskim rabotnikam. Dziela hetaha ŭrad wydaŭ specyjalny zakon, pawodle jakoha buduć adpraŭlać ad pracy čužych rabotnikaŭ i wysialać ich z Francyi.

Čuwać, što ŭ pieršuju čarhu pojduć rabotniki z Polščy, bo załamałasia francuska-polskaja družba.

# Sawiety zbrojacca suproć Japonii i Anhlii.

Na Dalokim Uschodzie sawieckija zbrajeńni suproć Japonii ŭžo zakončany. Tam jość pryblizna 600 tysiač sawieckaha wojska. Znataki tamašniaha pałažeńnia ćwierdziać, što bolšaj zbrojnaj siły Sawiety tam pastawić nia mohuć, bo nia zmohuć balšawiki dla bolšaj armii dastawić ježy i amunicyi. Sibirskaja čyhunka choć maje i padwojnaje pałatno rejak, ale jana nastolki drennaja, što nie pierawozić i taho, kolki pierawoziła carskaja adnapałotnaja čyhunka ŭ časie rasiejska-japonskaj wajny.

Ciapier Sawiety hałoŭnuju ŭwahu źwiarnuli na Siaredniuju Aziju, na pahraničča kitajskaha Turkiestanu i Afhanistanu. Tam balšawiki paśpiešna budujuć čyhunki i šosy i adnačasna nawoziać tudy wialikija masy wojska. Z druhoha boku balšawiki niawolničaj siłaj (aryštawanymi) budujuć čyhunki praz Dahiestan, jakija buduć zabiaśpiačać žaroły nafty ŭ Baku, ad jakich mohuć adciać maskoŭski centr paŭstancy ŭ Hruhii i Dahiestanie i adnačasna buduć pahražać Persii i bahdadskaj darozie Anhlii ŭ Indyju. Henyja prociŭanhielskija pryhatawańni Sawietaŭ najaŭna widawočnyja i Anhlii.

Sawiety prakanany, što miž Anhlijaj i Japonijaj jość tajnaje parazumieńnie suproć ich, jak było ŭ časie rasiejska-japonskaj wajny, a dziela hetaha balšawiki pačali zbroicca i suproć Anhlii.

Kali-b dajšło da wajny Sawietaŭ z Japonijaj i Anhlijaj, to balšawikom trudna było-b wydziaržać, była-b chiba nadzieja tolki na suświetnuju kamunistyčnuju rewalucyju. Na jaje ŭ Maskwie tolki j spadziajucca.

# Новыя законы аб задоўжаных.

Пад канец мінулага м-ца былі апублікаваны новыя законы ( гл. Dz. U. R. P. № 94, 28.X.34), якімі ўводзяцца палёгкі для задоўжаных як у казённых, так і ў прыватных банках і ўстановах. З палёгкі гэтых законаў могуць карыстаць толькі тыя, хто задоўжыўся прад днём 1 ліпня 1932 г. і атрыманую пазычку ўлажыў у земляробскую гаспадарку. Новыя законы, хоць і вельмі абшырныя, маюць характар толькі агульны, гэтак званы рамовы. Да гэтых законаў маюць быць выдадзены йшчэ міністэрскія выканаўчыя распараджэньні, каторыя бліжэй азначаць: хто, як і на колькі з самых палёгкаў будзе карыстаць.

Выдадзеныя законы названы папольску законамі „oddłużeniowymi". Гэта ня знача аднак, каб гэтыя законы касавалі даўгі: яны у засадзе даўгоў не касуюць, а пераважна толькі раскладаюць іх на даўжэйшы час і абніжаюць апрацэнтаваньне. Абніжэньне (не касаваньне) самых даўгоў прадбачана законам толькі на той выпадак, калі пазычка была ўзята праз Дзяржаўны Зямельны Банк (Państwowy Bank Rolny) з гэтак званага Абаротнага Фонду Зямельнай Рэформы (Fundusz Obrotowy Reformy Rolnej) і выкарыстана на куплю гаспадаркі, на парцэляцыю, мэліарацыю, асушку грунтоў— прыватную або арганізаваную (Spółki Wodne) і г. д. У гэтых выпадках прадбачыцца абніжка доўгу на адну траціну і нават на палову.

Скасаваньню падлягаюць даўгі, якія Дзяржаўны Зямельны Банк перавядзе з Застаўных Лістоў і мэліарацыйных облігацый на Абаротны Фонд Зямельнай Рэформы. Скасаваньні даўгоў праводзе міністр Скарбу. На гэтыя абніжкі і скасаваньні даўгоў казна празначыла 340 мільёнаў зл. Апрача таго Міністр Земляробства мае да распараджэньня суму 30 міліёнаў зл. на „дадатковыя" скасаваньні даўгоў для тых даўжнікоў, якія, „паміма палёгак вынікаючых з закону, не маглі-б сплаціць даўгоў."

Усіх даўжнікоў закон дзеліць на тры групы. Да групы А залічваюцца тыя, хто мае ня больш 50 га зямлі, да групы В — хто мае ня больш 500 га і да групы С — хто мае ня больш 1.000 га. Найбольшыя палёгкі маюць быць прызнаны для даўжнікоў групы А.

Самыя даўгі дзеляцца на арганізаваныя і прыватныя. Арганізаваныя даўгі ў сваю чаргу бываюць кароткасрочныя і доўгасрочныя.

Справа кароткасрочных даўгоў у розных касах і народных банках будзе аканчальна вырашана выканаўчым распараджэньнем; праўдападобна ў тым сенсе, што разложацца яны на 14 гадоў і апрацэнтуюцца па $4\frac{1}{2}$ проц.

Доўгасрочныя даўгі ў банках, перад усім у ўспомненым Банку Зямельным, узятыя прад 1.VII.32 г, а так-жа нясплачаныя на пагашэньне іх раты, працэнты і іншыя нядоімкі, якія паўсталі прад 1.VII 34 г., могуць быць цяпер сконвэртаваныя Банкам аднастаронна на новыя доўгасрочныя пазычкі ў гэтак званых Застаўных Лістох. Аднастароннасьць гэткага сконвэртаваньня палягае на тым, што Банк яго праводзіць сам, ня пытаючыся даўжніка. — Хто даставаў пазычку праз Зямельны Банк з Абаротнага Фонду Зямельнай Рэформы, таму зьменшэньні і скасаваньні доўгу будуць прызнаны аўтаматычна, без адумыснага стараньня з боку даўжніка.*) Нескасаваная рэшта гэткага доўгу будзе разложана на час ад 5 да 60 гадоў з апрацэнтаваньнем ад 1.I.35 г. па 3 проц. гадавых.

Тым даўжніком, каторым доўг будзе разложаны на доўгія гады, а яны захацелі-б і маглі-б выплаціцца раней, закон прызнае вялікія ўступкі. І так, хто сплаце свае даўгі ў працягу першых двух гадоў, таму будзе даравана 20 проц. доўгу (за кожныя 100 зл. будзе плаціць толькі 80 зл), а хто сплаціць свой доўг у працягу трох гадоў, таму даруецца 10 проц. доўгу. Гэткая ўступка завецца боніфікатай.

Аб даўгох з прыватнай гіпотэкі тут гаварыць ня будзем, бо гэты выпадак у сялянскіх варунках надта рэдкі, а нават і сусім блізу немагчымы.

Даўгі з прыватных кароткасрочных пазычак, паводле новага закону і з моцы самага закону — бяз сумысных стараньняў — раскладаюцца на 28 паўгадовых ратаў, платных кожнага 1.IV і 1.X. Датыча гэта земляробаў групы А і В, прыватныя даўгі каторых павінны былі ўжо быць сплачаны, або час сплаты каторых выпадае прад 1.IV.35 г. Апрацэнтаваньне гэтакіх даўгоў вызначана па 3 проц. гадавых, пачынаючы ўжо ад .1.XI. 34 г. Хто, маючы гэтак разложаны свой доўг на 14 гадоў, сплаціць яго ў працягу трох гадоў, той кожнай сотняй злотаў сплачвае 150 зл. доўгу. — Калі аднак даўжнік не заплаціць дзьвюх гэтак разложаных ратаў адна за другой, дык крэдытор мае права ўвесь доўг спагнаць за адным разам і зараз-жа, пры помачы каморніка.

Разьемчыя Управы (Urząd Rozjemczy), на падставе новага закону, у працягу трох гадоў могуць зьмяншаць сямейныя сплаты, калі падзел быў зроблены у міжчасе ад 1.I.26 г. да 1.VII.32 г. Гэтыя-ж Управы могуць таксама зьмяншаць і купную цану рэшты зямлі.

Гэтулькі — згушчана — можна сказаць аб пастановах новага закону. Аб выканаўчых распараджэньнях да яго напішам наступным разам. Зазначым тут толькі засьцярогу ўрадавых кругоў, што „палёгкі" новага закону маюць быць апошнімі і сялянства ня можа ўжо нічога больш для сябе ад ураду спадзявацца, а толькі сплачываць назначаныя яму часьці усякіх даўгоў. —

Ня ўходзім у ацэнку слушнасьці гэткай засьцярогі. Ня можам аднак устрымацца ад запытаньня: а што будзе, як з згалеўшай вёскі ня ўдасца выціснуць і адзінага граша?

р.

*) Дзеля гэтага кожны, хто так ці гэтак задоўжаны ў Дзярж.Зямельным Банку, ува ўласным зразумелым інтарэсе павінен спраўдзіць, ці ягоны доўг паходзіць з сумаў банковых ці з вышэйуспомненага Абаротнага Фонду Зямельнай Рэформы.

## Balšawiki abjednywajucca z mienšawikami

Kamunisty zhubiŭšy swaje ŭpływy na rabotnickija masy ŭ Eŭropie pačali šukać sposabu, kab nie zbankrutawać akančalna. Kamunistyčny III Internacyjanał zaprapanawaŭ socyjalistyčnamu II Internacyjanału „pamirycca“ i stwaryć „supolny front“. U hetaj sprawie miž II i III Internacyjanałami pačalisia bieskaniečnyja pierahawory. Socyjalisty niekatorych krajoŭ, što naležać da II Internacyjanału, zažadali, kab balšawiki pierastali prašledawać mienšawikoŭ u Sawietach dy zaklučyli i tam „supolny front“, a socyjalisty Anhlii, Holandyi, Skandynaŭskich dziaržaŭ, Čechasławaččyny i inšych dziaržaŭ prapazycyju III Internacyjanału susim adkinuli. Abjadnalisia socyjalisty z kamunistami tolki ŭ Francyi.

Z hetaha bačym, što kamunizm u cywilizawanaj Eŭropie nia maje posłuchu. Kamunizm, ci balšawizm, jak widać, idzie poruč z ciemraj, bo ŭ cywilizawanym narodzie siarod kulturnych rabotnikaŭ raźwiwacca nijak nia moža.

## Хроніка „Студэнскай Трыбуны“.

**Зьмена ў складзе Рэдакцыйнае Калегіі „Ст. Трыбуны.“** На мейсца выбыўшых двух сяброў,—кал. мгр. Я. Шутовіча, з прычыны скончэньня ім унівэрсытэту, і кал. М. Татарыновічанкі, з прычыны ейнага выезду дзеля ўнівэрсытэцкай навукі ў Львоў, — у склад Рэд. Калегіі ўвайшлі калегі: А. Дасюкевіч і С. Коўш.

**Новых сяброў БСС,** у бягучым акадэміцкім годзе, да сяньняшняга дня ўступіла 18. Вітаем! Але трэба памятаць, што яшчэ ёсьць шмат на У.С.Б. студэнтаў беларусаў, т. зв. „дзікуноў“, якіх трэба „вылавіць“ і ўцягнуць у сваю арганізацыю.

**Пазбаўленьне правоў двух сябраў Ураду БСС.** Урад БСС дня 12 г. м. падаў да ведама сяброў БСС, што сябры Ураду калегі Смаль і Грамыка, — пастановай Куратара БСС. праф. Кошмідэра пазбаўляюцца правоў функцыйных. Гэткая пастанова Куратара выклікана „грахамі“ праўна-фармальнага характару гэных сяброў Ураду.

**„Чыстка“ у БСС.** У пачатку сёл. акад. году Урад БСС пастанавіў ачысьціць Саюз ад маласьведамага элемэнту. Аднэй з праяваў браку сьведамасьці—гэта малое зацікаўленьне і ігнараваньне некаторымі сябрамі БСС сваіх абавязкаў. Сярод іх ёсьць такія, што па году і больш не зьяўляліся ў Саюз і за некалькі год не плацілі сяброўскіх складак. Такіх адзінак Урад скрэсьліў з ліку сяброў БСС. Гэткі крок Ураду вітаем. Сапраўды, сорамна, каб сябры Саюзу нядбала адносіліся да сваіх абавязкаў!

**Дадатняя праява.** У бягучым акадэміцкім годзе заўважваецца дадатняе зьявішча, якое сьведчыць аб пашырэньні беларускай нацыянальнай сьведамасьці. Некаторыя абітур'енты польскіх гімназіяў — сяньня студэнты УСБ—пачуваюцца Беларусамі і запісваюцца ў Бел. Студ. Саюз.

**Дзейнасьць БСС.** Насупроць дэмагогічных заўваг „Роднага Краю“ аб „бяздзейнасьці БСС.“, гэты апошні ў меру сваіх сілаў, як у мінулых гадох, так і сёлета, праяўляе інтэнсыўную дзейнасьць.

Сёлета ад пачатку акад. году ужо БСС: 1) сарганізаваў інаўгурацыйны вечар, з рэфэратамі калегаў В. Войтанкі і Я. Шутовіча. 2) сарганізаваў,—супольна з літоўскім і украінскім студэнскімі саюзамі таварыскі вечар дзеля задэманстраваньня, — супроць опініі некаторай польскай прэсы, аб сварках паміж успомненымі студэнскімі арганізацыямі трох братніх (беларускага, літоўскага і ўкраінскага) народаў, — сваей лучнасьці і заманіфэставаньня прынцыпу: in necessariis unitas, 3) сарганізаваў урачысты вечар у чэсьць Цёткі, рэцэнзію якога падаём на іншым мейсцы, а ў суботу дн. 24-га г. м. адбудзецца традыцыйная запазнаўчая гарбатка.

Сябры БСС, дзеючы на грунце сваей арганізацыі, бяруць актыўнае ўчасьце і ў дзейнасьці студ. Т-ва Беларусаведы.

**У студэнскім Т-ве Беларусаведы** пры УСБ ад пачатку бягучага акад. году адбылося ўжо некалькі навуковых зборак. Чарговая навуковая зборка адбудзецца ў нядзелю дня 25.XI с. г. у салі VI-ай галоўнага будынку ўнівэрсытэту. На парадку дзенным — колектыўны рэфэрат, гр. дра Я. Станкевіча, мгр. Ст. Станкевіча і студ. В. Тумаша, на тэму: „*Мова беларускай прэсы ў Вільні.*“

Пачатак а гадз. 17-й. Уваход вольны для ўсіх. Тэма рэфэрату павінна зацікавіць беларускае грамадзянства ў Вільні.

**Камісія Помачы Беларускай Студэнскай моладзі** пры Беларускім Нацыянальным Камітэце ў Вільні паўстала на сходзе Б. Н. К. дня 28.X. с. г.

Вітаем ейнае паўстаньне! Заклікаем усё беларускае студэнства аднясьціся да яе позытыўна, ахвяровываючы сваё супрацоўніцтва — дзеля асягненьня ёю пастаўленых мэтаў.

**Беларускае студэнства заграніцай.**

—Нас паведамляюць з Прагі (Чэхаславаччына), што: 1) у Аб'еднаньні Беларускіх Студэнскіх Арганізацыяў (АБСА) гэтымі днямі мае адбыцца рэфэрэндум, 2) што рыхтуецца „Бюлетэнь“ — орган АБСА, дзе будзе зьмешчана падробная справаздача з дзейнасьці АБСА, 3) што новых беларускіх студэнтаў нажаль сёлета ў Празе нямашака.

Як ведама, Бел. Студ. Саюз у Вільні, які доўгі час — некалькі год—быў сябрам АБСА, — у мінулым акад. годзе атрымаў ад Міністэрства Асьветы польскай рэспублікі забарону належаць да АБСА. Дзеля гэтага БСС сёлета ня можа браць удзелу ў рэфэрэндум.

—Студэнты Беларусы рыскага ўнівэрсытэту (Латвія) арганізуюцца. Мае паўстаць беларуская студэнская арганізацыя п. н. «Alboruthenica.“

Ужо статут гэтай арганізацыі паданы адпаведным уладам дзеля легалізацыі. Вітаем!

# Roznyja wiestki.

## Z UKRAINSKAHA ŽYĆCIA.

**Ukrainskaja mowa ŭ prawasłaŭnaj Carkwie na Wałyni.** Wałynskaja prawasłaŭnaja kansystoryja ŭ Kremiancy pry jeparchijalnym biskupu Alaksieju wydała zahad, kab duchawienstwa henaj jeparchii ŭ pierapiscy z swaim duchoŭnym načalstwam užywała tolki mowy ŭkrainskaj, a nia ruskaha jazyka, jak było dasiul.

Kali-ž heta budzie ŭ jeparchijach biełaruskich, što świaščeńniki buduć užywać mowu biełaruskuju i pierastanuć šyryć maskoŭščynu?

## Z POLŠČY.

**Školnaja danina.** Kab nia zwužywać pačatkawaha školnictwa, patrebny hrošy, bo ŭściaž polski skarb maje chroničny niedabor. Dziela hetaha prydumali školnuju daninu Henuju daninu, jak padajuć hazety, buduć i płacić ułaśniki kwater, nawat i tyja, što majuć kwateru z adnaho pakoju. Pa siołach henu daninu buduć płacić usie haspadary, što majuć chaty, jakich buduć ličyć za ŭłaśnikaŭ kwater z adnaho pakoju.

**Čystka ŭ B.B.** Biespartyjny Blok apošnimi časami zanadta zachlapaŭsia rožnarodnymi aferami niekatorych swaich siabroŭ. Dziela hetaha rašyŭ prawieści ŭ swaich radoch hieneralnuju čystku. Partyjnyja ŭłady B.B. prykazali swaim mužom dawieru, kab wyčyścili swaje jačejki wyklučajučy ŭsich skampramitawanych asob. U adnym waršaŭskim wokruzie „wyčyščana“ hetkich siabraŭ B.B. 60 proc.

**Hatowiacca da wybaraŭ.** Polskaja apazycyjnaja presa padaje, što ŭłady B.B. zahadali ŭžo prystupić da arhanizacyi wybarnaj akcyi. Heta maje być padhatoŭka da wybarnaj kampanii ŭ Sojm i Senat. Henaja partyja B.B. maje na mecie prawiaści ŭ Sojm i Senat až try čaćwiertych swaich pasłoŭ. Kali ciapierašni Sojm nia končyć pieramieny konstytucyi, dyk heta ŭsio wykanaje nowy Sojm.

**Biazhramatnaść.** U Polščy, pawodle pierapisi nasielnictwa, było analfabetaŭ: u haradoch 955.972 i 5.585.221 u wioskach, razam — 6.541.193. U Waršawie žywie 200 tysiač analfabetaŭ, h. zn. kožny 6 čaławiek susim niahramatny. Cywilizacyja nia šyrokaja!

**Spadak na biržy.** Apošnimi dniami pačaŭsia ŭ Polščy spadak kursu cennych papieraŭ: dziaržaŭnych i prywatnych. Pryčynaj hetamu—byccam 150 miljonny niedabor dziaržaŭnaha biudžetnaha preliminara.

## Z ZAHRANICY.

**Niamiecka-japonski Sajuz.** Anhielskija hazety pišuć, što miž Japonijaj i Niamieččynaj uzrastaje sapraŭdnaje zbližeńnie. Apošnimi časami mnoha pryjechała ŭ Japoniju niamieckich karespandentaŭ roznych hazet. Henaja haścinnaść papieradžaje pryznańnie niamieckim uradam Mandžury i zaklučeńnie abaronnaha sajuzu miž Niamieččynaj i Japonijaj.

**Aryšty kamunistaŭ.** U Łatwii palicyja nadowiačy natrapiła na centralnuju kamunistyčnuju arhanizacyju, jakuju całkom aryštawała.

**Stalin siabie skanfiskawaŭ.** U 1929 h. napisaŭ Stalin brašuru „Hod mahutnaha ŭzdymu“. U hetaj brašury jon napisaŭ, što za try hady Sawiety buduć najbahaciejšaj na świecie krainaj na chleb. Kali prajšło try hady i ŭ Sawietach chleb susim „łapci spłoŭ“, Stalin zahadaŭ henuju swaju brašuru skanfiskawać. Ciapier, chto henuju brašuru pašyraje, moža być sasłany na Sałoŭki.

**Pierawybary ŭ Sawietach.** Ad 1 h. m. pačalisia wa ŭsich Sawietach pierawybary sialanskich i haradzkich sawietaŭ. Tam možna „hałasawać“ tolki za tych kandydataŭ, jakich wyznačyć kamunistyčnaja partyja. Henyja wybary majuć končycca da Nowaha Hodu.

**Balšawiki pradajuć Władywastok.** Rasiejskaja presa padaje, što Sawiety, kab pazbycca strachu Japonii, pradajuć joj Władywastok i ŭsiu tamašniuju Prymorskuju obłaść.

## Z KRAJU.

**Što raskazwajuć biełaruskija turysty pa Polščy.** Hetymi dniami druhaja z čarhi tura waziła biełarusaŭ pa Polščy. Ab henaj pajezdcy biełarusy raskazwajuć hetak: Na hety raz nikomu nie baranili zachodzić u Wilni da centralaŭ swaich arhanizacyjaŭ. U darozie pytali i zapisywali, chto da jakoj naležyć arhanizacyi abo partyi. U darozie na stancyjach karmili kaŭbasami z harbataj; na stancyju dla turystaŭ prywozili pa całym wozie kaŭbas. U haradoch spatykała wajskowaja arkiestra i adwodziła ŭ wajskowyja kazarmy, dzie wojska dawała ježu i prypynak. Pakazywali turystaŭ Prezydentu i mnoha kamu. U Waršawie na hruzawych aŭtamabilach wazili cały wiečar, pakazwajučy horad. Widzieli miž inšym i šybianicy. Doraha heta kaštawała dziaržawie, kazali turysty. Pry hetym ćwierdzili, što heta była ahitacyja „za Polšč“. Mnohija kazali, što prajechacca hetak nikomu niŭčym nie paškodzić.

## Z WILNI.

**Biezrabоćcie.** U Wilni i ŭ Wilenščynie ciapier jość zarejestrawanych biezrabotnych 6136 asob.

**Tyfus.** U min. tydni zachwareła 27 asob na tyfus.

---

Wincuk Adważny. 22)

# Chłapiec.

POWIEŚĆ.

### I. Familijnaja Rada. (*Praciah*).

Jašče treba było Hanuli adbyć adnu radu, — z samym Wincusiom.

A Wincuś byŭ toj samy wichrawaty chłapiec, z katorym my byli znajomy ŭ pieršaj čaści hetaj powieści. Choć mieŭ užo dwanaccać hadoŭ, ale padros wielmi niamnoha, dy jašče bolej pacianieŭ, — jak kazali susiedzi, „wysach ad nawuki.“ Ale wočy byli tyja samyja: žywyja. jak dwa ahońčyki, hłyboka-pranikliwyja — matčyny wočy, u katorych kryłasia dumka, niepaniatnaja čužym ludziam, a nawiet rodnaj matcy. Chłapiec da ŭsiaho byŭ cikawy. Asabliwa lubiŭ raskazy ab histaryčnych padziejach, wialikich i strašnych pryhodach. Čytaŭ wielmi mnoha, a pośle heta pieradumywaŭ, pieražywaŭ sam i časta śniŭ.

Hledziačy sa starany na chłapca, susiedzi prazywali jaho ksiandzom, a chłapcy dražnili hetym i stroili rožnyja žarty. Wincuk adnakža nie abižaŭsia, ale jašče bolš uhłyblaŭsia ŭ knižki.

Naahuł u tyja časy, kali wielmi mała było školaŭ i ŭleźci ŭ ich było trudna, dyk chto adważyŭsia wučyć syna, hetym samym dawaŭ znak, što kiruje jaho na ksiandza. Druhich wučonych prafesijaŭ na biełaruskaj wioscy tahdy jak i nia bywała. U dachtary papadali tolki bahatyja. U adwakaty — taksama. Zrešta lačylisia tahdy nia mnoha i to swaimi ziołačkami i naahuł chwarobaŭ było mienš. Sudzilisia taksama swaim sposabam—u wałaścioch, hdzie za prastupki siekli rozhami, abo sadzili u „chałodnuju,“—dyk i adwakaty byli niepatrebny. Tolki adna prafesija była zaŭsiody nieabchodnaja i zrazumiełaja sialanam — heta ksiandzoŭstwa.

Hanula taksama cichańka spadziawałasia, što syn budzie ksiandzom. I maliłasia ab heta bieskaniečna. A sam Wincuś tymčasam saŭsim ab ksiandzoŭstwie nia dumaŭ. Jaho paciahiwała tolki adno pažadańnie — wučycca.

— Jakža budzie, Wincuś, — probawała Hanula chłapca, — ci budzieš ty šaŭcom?

— Mamačka, choć mianie zarežcie, — nia budu! Na śmierć nia lublu šawiectwa! Na što wy mnie jaho nawiazywajecie?

— A što ŭ im błahoje? — jašče pytałasia Hanula. — Žyćcio šaŭca spakojnaje, praca nie ciažkaja i kusok chleba možna zarabić, i mianie prakormiš da śmierci.

— Ci, mama, śmiaješsia, ci sapraŭdy kažaš? Bo, kali praŭda... — Wincuk niaskončyŭ i pilna hladzieŭ matce ŭ wočy.

— Kali, kaža, śmiaješsia, dyk — ničoha, a kali sapraŭdy, dyk... Tut užo wočy nalilisia ślazami i chłapiec ledź moh strymacca. U fantazii chłapčaniaci tak žywa rysawaŭsia abraz šaŭca i wonkawyja abstawiny — skura, dratwa, brudny stolik z rožnaj drabiazoj i sam šawiec — zhorbleny, zasmolenyja ruki, što Wincuk pužaŭsia samoj nazowy i ŭspaminu. I nia było na świecie takoj siły, katoraja mahła-by pryłamać chłapca da šawieckaha warštatu. — Uciaku kudy niebudź! — kazaŭ jon matcy.

Kažuć, što Boh ad rodu naznačaje čaławieku asobnaje pryzwańnie, i ščaśliwy budzie toj, chto za hetym pryzwańniem pojdzie. Ale musić taksama Boh pryščepliwaje nialubaść da inšych zaniaćciaŭ, kab čaławiek nia braŭsia za pryzwańnie nieadpawiednaje. Tak było i z Wincusiom. I Hanula heta dobra zrazumieła.

— Što-ž ja zrablu? —kazała jana susiedziam, musić Boh tak choča.

— Dyk kim ty, synok, chočaš być? — pytałasia jašče Hanula. Ty ŭžo chłapiec nie mały. Što ty sam sabie zadumaŭ?

— Ja jašče j sam nia wiedaju, — kazaŭ Wincuk. — Mnie tolki chočycca wučycca i wučycca. Ab tym pośle padumajem.

Na hetaj radzie z Wincusiom było pastanoŭlena ŭ wosień zdawać ekzamin u Nowa-Murawanskuju pawietawuju školu, a ciapier uziacca za padhatoŭku.

# №1(12). СТУДЭНСКАЯ ТРЫБУНА 25.XI.34.

## Нашая ідэолёгія.

Выдаём у бягучым акадэміцкім годзе першы № „Студэнскай Трыбуны“. Клічам нашым першым — усе пад сьцяг нацыянальны, клічам другім — соцыяльным — прэч з вызыскам чалавека над чалавекам, політычным ідэалам — незалежнасьць Беларусі.

Вось галоўныя клічы-пункты нашай ідэолёгічнай плятформы, нашага ідэолёгічнага твару. Усе яны ў сянешні час маюць для Беларусаў амаль аднолькавае значэньне, усе яны для нас зьяўляюцца важнымі. Сынтэзай іх — словы нашага народнага песьняра Купалы, — „людзьмі звацца“.

Будзем „звацца людзьмі,“ самі разам з народам, калі ў народзе нашым узбудзім нацыянальную сьведамасьць, калі пераканаем народ свой у тым, што ён зьяўляецца асобнасьцяй, зборнай індывідуальнасьцяй, абдаранай сваімі псыхо-фізычнымі ўласьцівасьцямі, калі створым сьведамасьць, што народ наш — насупраць цьверджаньня нашых розных колераў „дабрадзеяў“ — ня ёсьць нейкай этнічнай масай, плыняй, з якой можна што хочыш рабіць, — што народ наш крые ў сабе вялікія творчыя сілы, і што ён, каб „людзьмі звацца“ павінен увайсьці на правох роўнасьці ў сям'ю усіх народаў, заняць пачэснае месца ў міжнародным канцэрце. З гэтага вынікае, што ўсе Беларусы, а прадусім беларускае студэнства, павінны належна разважаць на ўсе падходы тых, хто імкнецца да зьнішчэньня нацыянальнага твару, індывідуальнасьці беларускага народу, — ці гэныя „тыя“ будуць з пад знаку комуністычнага інтэрнацыяналу, ці яны будуць з пад знаку агрэсыўнага, жарлочнага нацыяналізму суседуючых з беларускім народам. Не зьяўляемся старонькімі шовінізму. Стаім на грунце нацыяналізму абаронната, нацыяналізму, як зьявішча амаль прыроднага, людзкога. Дзеля гэтага разьмінаемся, а на'т стаім на грунце барацьбы, з марксіцкай тэорыяй, паводле якой нацыяналізм ёсьць выдумкай буржуазнай, ёсьць нейкай непатрэбнай надбудоўкай, ёсьць зьявай, з якой трэба рашуча змагацца.

Другім пунктам нашай праграмы, — праграмы ў плошчы соцыяльных адносінаў, — ёсьць постулят прыйнага ўсанкцыянаваньня найвышэйшага этычнага і разам з гэтым грамадзкага імпэратыву: любі бліжняга свайго, як сябе самога. Хрыстос ужыў сілы фізычнай, каб выгнаць з сьвятыні розных спэкулянтаў гандляроў, якія выкарыстоўваюць чалавека, кошт ягоным жывучь. Зашмат спэкулянтаў маем у сучаснасьці, і ім добра жывецца. Мільёны ж людзей пухнуць і паміраюць з голаду, — мадзеюць у нястачах матэр'яльнага і духовага характару. Гэткае зьявішча ёсьць праклёнцам сучаснай „высокай“ культуры і цывілізацыі і выклікае перабудову грамадзкага ладу. Яна — перабудова, — асабліва сяньня, жыва, на нашых вачах, адбываецца, і мы дзейна павінны да яе адносіцца, стараючыся папхнуць яе ў кірунку грамадзкага радыкалізму, у кірунку здабыцьця для беларускіх сялянскіх і работніцкіх гушчаў, для ўсяго беларускага народу, — людзкіх варункаў быцьцяваньня; — папхнуць яе ў кірунку правядзеньня ў жыцьцё грамадзка-этычнага імпэратыву — любі бліжняга свайго, як сябе самога, і постулят, што на адно выходзіць, „людзьмі звацца“.

Вынікам гэтага, павінна быць не скасаваньне поўнае прыватнае ўласнасьці, як гэта робяць комуністы, але яе агранічэньне і to агранічэньне яе на карысьць грамадзкую. Дапушчаем гаспадарчы колектывізм, але пад варункам, што ўводзіцьць яго трэба спосабам дабравольным. Гаспадарчы колектывізм, праводжаны сяньня камуністамі ў СССР прымусова — „ударніцкім,“ бальшавіцкім тэмпам — давёў — сьмеем цьвердзіць — СССР, б. расейскую імпэрыю, самавыстарчальную ў сэнсе гаспадарчым краіну, — да торбы, да жабрацтва, да таго, што мільёны грамадзян бальшавіцкае дзяржавы сьняць аб штодзенным кавалку хлеба, і ня маючы яго, паміраюць з голаду. Гэты экспэрымэнт прымусовага ўдарнага колектывізму, як бачым, рызыкоўны і нязгодны з інтарэсамі найбольш пакрыўджаных слаёў грамадзянства, якімі у першую чаргу ёсьць сяляне і работнікі.

Агулам кажучы ў плошчы соцыяльных адносінаў стаім на грунце этычнага паднясеньня грамадзянства, на грунце дэмократызацыі, а гэтым самым паднясьця роўня эканамічнага і духовага грамадзянства.

Трэцім пунктам, ня менш важным ад двух папярэдніх, будучым консэквэнцыяй лёгічнай і каронай гэных папярэдніх, ёсьць постулят політычнай незалежнасьці Беларусі. Індывідуальнасьць беларускага народу будзе захавана і правідлова разьвівацца, а так-жа перабудова грамадзкага ладу ў духу карысным для беларускага народу адбудзецца толькі тады, калі будуць створаны адпаведныя абставіны. Гэныя абставіны, як сьцьвярджае гісторыя народаў, як тых, якія ўжо атрымалі незалежнасьць, як і тых, якія імкнуцца да яе здабыцьця, даець політычная незалежнасьць. І сьмеем цьвердзіць, што не зьяўляецца жывым народам той народ, які выракаецца гэнага ідэалу і што такі народ згубіў годнасьць і вартасьць людзкую, і што ён ёсьць народам нявольнікаў. І дзеіцца ня трэба, што народы дзеля здабыцьця сваей дзяржаўнай (політычнай) незалежнасьці плацяць за яе морам крыві, складаюць вялікія ахвяры. Гэткія народы знаюць цану і вартасьць самастойнага незалежнага жыцьця.

Народы, нездабыўшыя політычнай незалежнасьці, як цьвердзіць таяж гісторыя народаў, — зьяўляецца прадметам эксплёатацыі, прадметам духовага і матэр'яльнага вызыску, прадметам паніжэньня, — з боку тых народаў, якія іх „сваёй“ політычнай незалежнасьцяй „абдарылі.“ Сьцьверджаньнем гэткага зьявішча ёсьць хоцьбы і сяньняшняе беларускае палажэньне. Пагляньма для прыкладу на Беларусь Усходнюю, Савецкую. У так зв. Сав. Беларусі, окупованай комуністычнымі ўладамі, гэныя ўлады рашуча выкарчоўваюць беларускую душу, індывідуальнасьць беларускага народу, праводзяць рэформы соцыяльнага характару ў духу нязгодным з патрэбамі гэтага-ж беларускага народу. Там народ беларускі зьяўляецца прадметам духовага і фізычнага нішчэньня, там гэныя ўлады трымаюць яго ў прыгоне дзеля асягненьня доктрынальнага, так зв. „соцыялістычнага будаўніцтва.“ С. Беларусь зьяўляецца ельдорадам для маскоўскіх вялікадзяржаўнікаў, для комуністычных окупантаў. А як ёсьць у Беларусі Заходняй, — усе добра ведаем. І з гэткай беларускай сапраўднасьці вынікае ўгрунтаваньне нашага політычнага постуляту — зьдзейсьненьня ідэалу сувэрэннае Беларускае Дзяржавы.

Рэасумуючы выжэй сказанае аб нашай ідэолёгічнай плятформе, скажам, што сынтэз постулятаў нацыянальнага, соцыяльнага і політычнага — „людзьмі звацца“ павінен быць сынтэзам думак, мрыяў, пуцяводнай зоркай для кожнага беларуса, у асобнасьці для беларускага студэнта!

*Рэдакцыя „Студ. Трыбуны“.*

## Vox clamantis in deserto

У запярэчаньне ўсякім „робленым“ перапісам, паміма таго, што беларуская школа, а тымбольш гімназія, зьяўляецца сяньня музэальнай рэдкасьцяй, беларуская нацыянальная сьведамасьць усьцяж і нястрымана ўзрастае. Доказам гэтага на нашым студэнскім грунце зьяўляецца факт, што ў лічбе 18 новаўступіўшых сяброў Беларускага Студэнскага Саюзу ёсьць гадунцы польскіх дзяржаўных гімназіяў, адкрыта прызнаючыя сябе Беларусамі.

Але міма ўсяго, моладзь нашая праяўляе дзіўную апаласьць, недахоп жывейшага зацікаўленьня беларускімі справамі. Усе пачынаньні ці то арганізацыяў, ці то паасобных грамадзян не знаходзяць водгуку ў гэтай моладзі. Усе клічы пераважна праходзяць бяз рэха.

На лектарат беларускай мовы пры УСБ, які адбываецца рэгулярна штотыдзень, прыходзіць некалькі асоб. Асабліва дзіўная няпрысутнасьць тых студэнтаў Беларусаў, каторыя пакончаўшы польскія гімназіі слаба ўладаюць роднай мовай.

На рэфэратах студэнскага Т-ва Беларусаведы, адносна найбольшых зборках беларускай студэнскай моладзі, колькасьць прысутных далёка не адпавядае колькасьці ўсяе нашай моладзі на У.С.Б.

У № 41 „Беларускай Крыніцы“ і ў № 24 „Роднага Краю“ с. г. зьмешчана адозва Фр. Аляхновіча, заклікаючая да супрацоўніцтва дзеля арганізацыі беларускага тэатру. Пакульшто супрацоўніцтва сваё, як даведваемся, заахвяраваў толькі гр. Шыла.

А як прадстаўляецца справа хору, які ў свой часе існаваў пры БСС. і быў кіраваны ўмелай рукой гр. Р. Шырмы? Хор гэты сяньня не праяўляе ніякай дзейнасьці!

Ці можна гэта вытлумачыць недахопам людзей, могучых працаваць? Хіба не. Многія з пасярод студэнтаў і агулам моладзі добра абзнаёмлены з аматарскім тэатрам, многія маюць ужо і сякую такую практыку на гэтай ніве. А калі ходзіць аб хор, то шмат з беларусаў студэнтаў і агулам моладзі можа сьпяваць, і ўзмоцніць так важную беларускую культурную пляцоўку.

Успомненыя сумныя зьявішчы тлумачацца часткова недахопам часу. Але ў большасьці выпадкаў тормазам зьяўляецца беларуская нядбаласьць, нястача грамадзкага выробленьня, і страх перад эвэнтуальнасьцяй нарушэньня „лёяльнасьці,“ або прыклад і ўплывы нашых „ярка каляровых.“ А гэтым апошнім хіба не залежыць на разьвіцьці беларускага нацыянальна-адраджэнскага руху і беларускай культуры. У іх ёсьць свае „агульналюдзкія“ і „інтэрнацыянальныя“ мэты і заданьні.

Калі ў нас няма столькі сілы, волі і цывільнае адвагі, каб змусіць сябе цікавіцца нечым, маючым зьвязак з беларускай справай і нешта рабіць на карысьць гэтае справы, то ня дзівімся, што з намі і з нашымі жаданьнямі ніхто ня хоча лічыцца.

Шаў.

## Урачысты вечар у чэсьць Цёткі ў Б.С.С.

У суботу, дня 17-га г. м. у Беларускім Студэнскім Саюзе адбыўся вечар, прысьвячаны памяці беларускай грамадзкай дзеячы, поэты-рэволюцыянэркі, — Цёткі (Алёізы Пашкевіч-Кейрыс), — з нагоды прыпадаючых сёлета 30-х угодкаў ейнай грамадзкай і літэратурнай дзейнасьці. Ініцыятыва заргінізаваньня вечару выйшла ад сяброваў Б.С.С., і яны разам з німаторымі калегамі з энтузыязмам і солідна прыступілі к дзелу.

Арганізацыйна-тэхнічны бок вечару выканены добра. Доказам гэтага—хоцьбы многалічная фрэквэнцыя прысутных. Артыстычна-дэкорацыйны бок —таксама амаль безза ган Самая праграма вечару,—якая складалася: 1) з уступнага слова старшыні Б.С.С., калегі Шчорса, 2) з рэфэрату абсальвэнткі, калежанкі Марысі Мілючанкі — аб жыцьці, грамадзкай і літэратурнай дзейнасьці Цёткі, ілюстраванага мясцамі дэкламацыямі вершаў поэткі, 3) з рэцытацыі нікатоных твораў поэткі, — выканана ўдачна. Кал. Шчорс у кароткіх словах адначыючы ўрачысты вечар падкрэсьліў заслугі Цёткі на ніве беларускага адраджэньня. Кал. М. Мілючанка, — якжа скромная ў сваей паставе!—з энтузыязмам, у глыбока перадуманым рэфэраце дала шмат цікаўных біографічных ведамасьцяў, выказала рэвалюцыйны запал, барацьбянасьць і ўчасьніцтва Цёткі ў грамадзкім жыцьці, а разглядаючы творчасьць поэткі прэлегэнтка выказала дынаміку і бунтарнасьць Цёткі ў перыядзе рэвалюцыйным (1905 г.), гарачы патрыётызм, шчырае каханьне бацькаўшчыны—у пэрыядзе творчасьці нашаніўска-народніцкім, і мінорнасьць, выкліканую хваробай (сухотамі) Цёткі— у пэрыядзе творчасьці індывідуальна-асабістым. Словам, кал. М. М. у прыгожых словах свайго рэфэрату выказала дастойнасьць і маестат беларускай жанчыны—Цёткі і слушна ў канцы заклікала сучасную беларускую жанчыну ісьці пад сьцягам Цёткі. Рэфэрат кал. Мілючанкі ёсьць вартаснай монографіяй і таму трэба старацца яго надрукаваць для публічнага карыстаньня. Дэкламатарам — у асобах кал. Э. Залкіндзянкі, Т. Трофімучанкі, Я. Малецкага, Б. Стэповіча і С. Сарокі — можна закінуць слабую падрыхтоўку. Слухачы атрымлівалі ўражаньне, што некаторыя з дэкламатараў дэкламуючы чытаючы вершы першы раз іх перад сабой бачаць. Гэта лічым ім за мінус і яго трэба высьцерагацца. Агулам, уражаньне з вечару надзвычайнае. Брава арганізатарам, у першую чаргу калежанкам!

Я. Ш.

Ведаем, што беларускае студэнства раскінута па розных унівэрсытэцкіх асяродках. І так у Польшчы ёсьць студэнты Беларусы на ўнівэрсытэтах: у Варшаве, Львове, Кракаве, Пазнані, Люблiне, а заграніцай — у Празе, Рыме, Лёндане, Парыжы, Ліоне, Бруксэлі, Бэрліне, Коўне, Рызе і інш.

Хацелі-б быць з усім беларускім студэнствам у кантакце. Просім дзеля гэтага адгукнуцца. Просім прысылаць інформацыі і артыкулы ў „Ст. Трыбуну“. Памятайма, што ў нацыянальнай лучнасьці — зарука лепшае будучыні Беларускага Народу. Усё адрасуйце на адрас: „Студэнская Трыбуна“, — Вільня, Завальная 1—1 (Poland — Польшча).

Няхай ніхто не вяжыць, што „Ст. Трыбуна“ друкуецца пры „Беларускай Крыніцы“. Рэд. Калегія „Ст. Трыбуны“ ў адносінах да „Бел. Кр.“ ёсьць аўтаномнай.

Той з беларускіх студэнтаў, хто стаіць на грунце ідэолёгіі „Ст. Трыбуны“, заўсёды знойдзе месца ў нашых радох і радасна будзе намі вітаны.

РЭД.-КАЛЕГІЯ „СТ. ТРЫБУНЫ“.

*Рэдакцыйная Калегія „Студэнскай Трыбуны“ ў складзе: А. Дасюкевіч, Я. Малецкі і С. Коўш.*

Redaktar Jan Paźniak. Biełaruskaja Drukarnia im. Fr. Skaryny ŭ Wilni, Zawalnaja 1— 3. Wydawiec A. Šutowič